## 2024 год – 505 гадоў з часу першага ўпамінання в. Імянін (Кобрынскі р-н; 1519)



Імянін - вёска ў Кобрынскім раёне Брэсцкай вобласці Рэспублікі Беларусь. Адносіцца да Буховіцкага сельскага савета Кобрынскага раёна. За 8 км на Пн ад горада і чыгуначнай станцыі Кобрын, 55 км ад Брэста.

Вёска Імянін мае багатую гісторыю. У 1519 годзе гэта быў маёнтак у Кобрынскім павеце ВКЛ. Вялікі князь ВКЛ і кароль Польшчы Жыгімонт I Стары сваёй граматай пацвердзіў правы баярына кобрынскага Некраша Сямёнавіча Качаноўскага на вечнае ўладанне дзвюма часткамі маёнтка Імянін і сялом Байкавічы, што знаходзілася побач. Адпаведна з граматай уладар маёнтка атрымаў землі за службу яшчэ ад князя Івана Сямёнавіча Кобрынскага каля 1459 года.

У 1559 годзе маёнтак Імянін знаходзіўся ва ўладанні пана Льва Некрашэвіча і чатырох братоў Ждановічаў. У 1563 годзе Імянін – маёнтак і сяло каля г. Кобрына ў Брэсцкім ваяводстве, у 1589 годзе – уладанне Т. Л. Заранка, пазней – Кобрынскага манастыра.

Пасля трэцяга падзелу Рэчы Паспалітай (1795) - у складзе Расійскай імперыі, у Кобрынскім павеце, з 1801 года ў Гродзенскай губерні. У 1845 годзе маёнтак Імянін і в. Востраў - уладанне Фелікса і Віктара Пуслоўскіх, 2644 дзесяцін зямлі. У склад маёнтка ўваходзілі вёска і фальварак Імянін (40 двароў, 305 рэвізскіх душ, 6 дваровых сялян), в. Востраў (25 двароў, 192 рэвізскія душы). У 1864 годзе адкрыта народнае вучылішча.

З 1877 года маёнтак стаў уласнасцю Севярына Навамейскага і складаў 951 дзесяціну зямлі. У маёнтку быў закладзены парк: мноства кустоў бэза, бярозавы гай, велізарная ліпавая алея, наўкол якой раслі магутныя дубы. Цэнтрам кампазіцыі быў сядзібны дом. У гэты час у в. Імянін пражывала 483 жыхары, быў пабудаваны хлебазапасны магазін, для рабочых – два двухпавярховыя будынкі з чырвонай цэглы (1901). Пасля смерці Севярына Навамейскага

ў 1908 годзе маёнтак адышоў яго адзінаму сыну Феліксу, землі падзелены паміж яго жонкай Марыяй, сынам Феліксам і дачкой Евай.

У 1890 годзе в. Імянін у Стрыгаўскай воласці, 737 дзесяцін зямлі. У 1897 годзе вёска – 73 двары, 483 жыхары, хлебазапасны магазін; 2 дамы для рабочых (Імянін), 63 і 7 жыхароў; 3 маёнткі, уладанні Валянціны, Адольфа і нашчадкаў Ілы Стэфаноўскіх. У 1905 годзе вёска (621 жыхар) і маёнтак (97 жыхароў); працавала аднакласная царкоўна-прыходская школа, у якой навучаліся 37 хлопчыкаў і 12 дзяўчынак. У 1911 годзе Імянін – вёска, 278 жыхароў; хутар, 319 жыхароў; два аднайменныя маёнткі, уладанні Севярына Стэфаноўскага і Фелікса Навамейскага, 165 жыхароў.

З 1921 года вёска ў складзе Польшчы, у Стрыгаўскай гміне Кобрынскага павета Палескага ваяводства; вёска – 74 двары, 469 жыхароў; фальварак – 5 двароў, 118 жыхароў. У 1930-я гады працавалі польская школа і чытальня.

З канца 1939 года - у складзе БССР, з 15 студзеня 1940 года - у Кобрынскім раёне Брэсцкай вобласці, з 12 кастрычніка 1940 года - у Лепясоўскім, з 30 кастрычніка 1959 года - у Яроміцкім, з 19 ліпеня 1976 года – у Буховіцкім сельсавеце. У 1940 годзе ў хутары Імянін налічвалі 145 двароў, 760 жыхароў; былы маёнтак – 3 двары, 8 жыхароў.

У Вялікую Айчынную вайну, з чэрвеня 1941 года да ліпеня 1944 года, Імянін акупіраваны нямецка-фашысцкімі захопнікамі. У першы дзень вайны камандзір 123-га авіяцыйнага знішчальнага палка, аэрадром якога знаходзіўся ля в. Імянін, маёр Сурын правёў чатыры паветраныя баі, асабіста збіў тры самалёты саперніка, быў смяротна паранены. У 1970-я гады на доме ў в. Імянін, у якім да пачатку вайны жыў Барыс Мікалаевіч Сурын (1907–1941), і на будынку сярэдняй школы ўстаноўлены мемарыяльныя дошкі.

У час вайны будынак школы быў спалены. Пасля вызвалення вучні займаліся ў арандаваных хатах. У 1947 годзе была пабудавана новая школа. З 1949 года школа ў вёсцы перайшла на сямігадовае (пазней васьмігадовае) навучанне, а з 1989 года стала сярэдняй.

На землях в. Імянін у 1950 годзе створаны калгас «Краіна Саветаў», у якім аб’ядналася 70 асобных гаспадарак (140 калгаснікаў), былі арганізаваны дзве брыгады. У выніку ўзбуйнення калгасаў у вёсцы быў створаны калгас імя Жданава. Паводле перапісу 1959 года ў вёсцы 704 жыхары, у

1970 годзе – 648 жыхароў. У 1999 годзе – 270 гаспадарак, 706 жыхароў, цэнтр калгаса «Кобрынскі».

У 1999 годзе калгас пераўтвораны ў ААТ «Агра-Кобрынскае». На сённяшні дзень гаспадарка займае перадавыя пазіцыі па розных паказчыках. Тут вырошчваюць збожжавыя культуры, развіта жывёлагадоўля, малочная прамысловасць. Асноўны напрамак дзейнасці – вырошчванне агародніны: капусту, сталовыя буракі, моркву і бульбу. Тут дзейнічае добротнае сучаснае сховішча для гародніны, дзе падтрымліваецца неабходны тэмпературны рэжым і створаны іншыя ўмовы для захавання прадукцыі.

З 1992 года ў вёсцы на тэрыторыі ў 40 га існуе дзіцячы аздараўленчы цэнтр «Жамчужынка» саюза евангельскіх хрысціян-баптыстаў. Тут створаны спрыяльныя ўмовы для адпачынку і аздараўлення дзяцей і пажылых людзей. Цэнтр мае спальныя карпусы для дзяцей і дамы для пражывання супрацоўнікаў, сталовую і пякарню, паліклініку для медыцынскага абслугоўвання, Дом міласэрнасці, сад і агарод.

У 2005 годзе ў в. Імянін 268 гаспадарак, 708 жыхароў; у 2009 годзе - 696 жыхароў. Па дадзеных на 1 студзеня 2024 года насельніцтва Імянін склала 608 жыхароў.

Нягледзячы на сталы ўзрост, Імянін не старэе. У вёсцы працуе шмат моладзі. Ёсць яслі-сад, дзе дзейнічае тры групы. Дзеці вучацца ў сярэдняй школе, маюць магчымасць займацца ў Імянінскай дзіцячай школе мастацтваў. Амбулаторыя ўрача агульнай практыкі – добры падарунак насельніцтву ў плане атрымання неабходнай медыцынскай дапамогі. У будынку амбулаторыі ёсць зубны і працэдурныя кабінеты, аптэка. Працуюць публічная бібліятэка, пошта, магазін «Смак».

У в. Імянін нарадзіўся Уладзіслаў Паўлавіч Падпалаў, вучоны ў галіне клінічнай медыцыны, доктар медыцынскіх навук (1996), прафесар, заслужаны дзеяч навукі Рэспублікі Беларусь, выдатнік аховы здароўя.

*Матэрыял падрыхтаваны ў 2019 г., дапоўнены ў 2024 г.*
*Кобрынскай цэнтральнай раённай бібліятэкай.*
*Курачук Святлана Дзмітрыеўна, бібліёграф І катэгорыі*
*аддзела абслугоўвання і інфармацыі*

**Імяніны** // Беларуская савецкая энцыклапедыя : у 12 т. – Мінск, 1972. – Т. 5. – С. 77.

**Імянін** // Гарады і вёскі Беларусі : энцыклапедыя. - Т. 4. кн. 2. Брэсцкая вобласць. – Мінск, 2007. - С. 150.

**Именин**, Буховичский сельсовет. Дом, в котором жил Сурин // Свод памятников истории и культуры Белоруссии. Брестская область. - Минск, 1990. - С. 257.

**Імянін**, Буховіцкі сельсавет. Мемарыяльная дошка Сурыну // Збор помнікаў гісторыі і культуры Беларусі. Брэсцкая вобласць. – Мінск, 1984. - С. 233.

**Імянін** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. – Мінск, 2002. - С. 583-584.

**Назвы** населеных пунктаў Рэспублікі Беларусь: Брэсцкая вобласць : нарматыўны даведнік / І. А. Гапоненка і інш.; пад рэд. В. П. Лемцюговай. — Мінск, 2010.— 318 с.

Гл. на с. 183.

**Несцярчук, Л. М.** Імянін / Л. М. Несцярчук // Замкі, палацы, паркі Берасцейшчыны X-XX ст. (гісторыя, стан, перспектывы) / Л. М. Несцярчук. – Мінск, 2002. – С. 195.

Колішні маёнтак – радавое гняздо Навумінскіх.

**Жучкевич, В. А.** Именины // Краткий топонимический словарь Белоруссии / В. А. Жучкевич. – Минск, 1974. – С. 146.

**Федорук, А. Т.** Усадьбы времен эклектики. Именин / А. Т. Федорук // Старинные усадьбы Берестейщины / А. Т. Федорук. – Минск, 2004. – С. 292, 502-503.

**Харузин, А.** Крестьянская хата в селе Именин / А. Харузин // Славянское жилище в Северо-Западном крае : из материалов по истории развития славянских жилищ / А. Харузин. – Вильна, 1907.

**Летапіс** роднай старонкі : гісторыка-краязнаўчы нарыс да 500-годдзя з часу першага ўпамінання в. Імянін Кобрынскага раёна / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; уклад.: С. Д. Курачук, Т. М. Баранская. – Кобрын, 2019. – 40 с : каляр. фота. - (Па вёсках нашага краю).

**Імянін** – 500 гадоў з часу першага ўпамінання (1519) // Зводны Каляндар дат і падзей Кобрыншчыны : краязнаўча-бібліяграфічны каляндар на 2016-2020 гг. / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад.: С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. – Кобрын, 2020. – С. 89.

**Імянін.** Мемарыяльная дошка Сурыну Б. М. // Захавальнікі гісторыі роднага краю : турыстычна-бібліяграфічны даведнік / ДУК «Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма», цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад.: С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. – Кобрын, 2016. – С. 162-163 : фота.

**Імянін.** Сядзіба Навумінскіх // Захавальнікі гісторыі роднага краю : турыстычна-бібліяграфічны даведнік / ДУК «Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма», цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад.: С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. – Кобрын, 2016. – С. 181-182 : фота.

**Падпалаў** Уладзіслаў Паўлавіч // Беларуская энцыклапедыя : у 18 т. - Мінск, 2000. - Т. 11. - С. 504.

**Атрошко, И.** «Старое Село»: здесь живет история / Ирина Атрошко ; фото Максима Пипченко // Хозяин. - 2023. - № 1. - С. 2-6 : фот.

Об агроусадьбе «Старое Село» в д. Именин Кобринского района и ее хозяйке Н. А. Корсаковой.

**Бакун, Е.** Именинский «Родны кут» / Елена Бакун ; фото: Елена Бакун // Кобрынскі веснік. - 2023. - 11 лютага (№ 11). - С. 4 : фот.

Магазин Кобринского райпо открылся в д. Именин Кобринского района.

**Бакун, Е.** О кибербезопасности детям / Елена Бакун ; фото: Елена Бакун // Кобрынскі веснік. - 2023. - 25 лістапада (№ 69). - С. 15 : фот.

Именинская СШ стала первой в Брестской области, где реализуется проект «Кибербезопасность детям».

**Бакун, Е.** С заботой о детях / Елена Бакун ; фото из архива Именинской СШ // Кобрынскі веснік. - 2023. - 11 лістапада (№ 67). - С. 8 : фот.

В рамках благотворительного проекта ОАО «АСБ Беларусбанк» «В школу с Беларусбанком» ГУО «Именинская СШ» первой в Брестской области получила новый автобус.

**Бакун, Е.** С любовью к профессии / Елена Бакун ; фото: Елена Бакун // Кобрынскі веснік. - 2023. — 18 лістапада (№ 68). — С. 8 : фот.

О семье молодых специалистов Валентине и Яне Кравчук из ОАО «Агро-Кобринское».

**Белов, Д.** Вопросы, которые волнуют всех / Дмитрий Белов ; фото: Дмитрий Белов // Кобрынскі веснік. - 2023. — 4 лістапада (№ 66). — С. 6 : фот.

В деревне Именин Кобринского района состоялся День открытого письма.

**Белецкая, Т.** Лавка у печи на разного гостя / Татьяна Белецкая ; фото автора // Сельская газета. - 2022. — 12 марта (№ 28). — С. 16—17 : фот.

Об агроусадьбе «Старое Село» в д. Именин Кобринского района и ее хозяйке Н. А. Корсаковой.

**Дому** милосердия Союза ЕХБ в РБ -— 10 лет // Крыніца жыцця. - 2022. — № 4 (июль-август). — С. 10—12 : фот.

О Доме Милосердия, созданном на территории ДОЦ «Жемчужинка» в деревне Именин Кобринского района более десяти лет назад.

**Елизарова, Ж.** С днем рождения, школа! / Жанна Елизарова // Кобрынскі веснік. - 2020. — 30 верасня (№ 76). — С. 4 : фот.

Именинской средней школе исполнилось 115 лет.

**Пашкович, Л**. В. Земляки помнят / Людмила Пашкович // Заря. - 2020. — 16 декабря (№ 101). — С. 17.

Памятный знак погибшим во время Великой Отечественной войны установлен в д. Именин Кобринского района.

**Пашкович, Л. В.** Память, вписанная золотыми буквами / Людмила Пашкович // Кобрынскі веснік. - 2020. — 12 снежня (№ 96). — С. 4 : фот.

В д. Именин Кобринского района установили памятный знак о сельчанах погибших в годы Великой Отечественной войны.

**Бакун, А.** Усё пачынаецца з кахання / Алена Бакун // Кобрынскі веснік. - 2019. — 16 сакавіка. — С. 1, 2.

Сям'я Якаўлевых з в. Імянін — пераможца конкурсу «Шматдзетная сям'я года».

**Бялоў, Д.** Імянінскай дзіцячай школе мастацтваў – 30 гадоў / Дзмітрый Бялоў // Кобрынскі веснік. – 2019. - 15 мая. – С. 5.

**Бакун, А.** Тут здзясняюцца мары / Алена Бакун // Кобрынскі веснік. - 2017. — 28 чэрвеня. — С. 5.

У 2016-2017 навучальным годзе ў Імянінскай дзіцячай школе мастацтваў налічвалася 100 навучэнцаў.

**Юшкевич, П.** Технологии стабильных рекордов / Павел Юшкевич // Сельская газета. - 2017. — 16 ноября. — С. 16.

ОАО «Агро-Кобринское» — небольшое предприятие, где работают около 150 человек.

**Дубіна, Л.** 165 гадоў працы на ўсіх / Людміла Дубіна // Кобрынскі веснік. - 2016. — 3 жніўня. — С. 1.

У межах святкавання Дня горада сям`я Нікіцюк з ААТ «Кобрынскае» адзначана дыпломам райвыканкама, як сямейная дынастыя з 165-ю гадамі агульнага працоўнага стажу.

**Марчук, Н.** История Чёрной Мадонны, или возврату… подлежит! / Нина Марчук // Кобрынскі веснік. – 2016. – 20 октября. – С. 5.

История имений Стригово, д. Именин.

**Сенчук, В.** «Время праздничных итогов и новых ориентиров» / Владимир Сенчук ; [беседовал] Александр Курец // Сельская газета. - 2016. — 3 сентября. — С. 8.

Лидером среди хозяйств Брестской области по урожайности зерновых является ОАО «Агро-Кобринское».

**Ярмошук, Н.** Чем наполним закрома? / Николай Ярмошук // Заря. - 2016. — 3 сентября. — С. 4.

ОАО «Агро-Кобринское» является лидером в Брестской области по урожайности зерновых.

**Бялоў, Д.** Высокая планка «Агра-Кобрынскага» / Дзмітрый Бялоў // Кобрынскі веснік. - 2015. — 23 верасня — С. 1, 2.

ААТ «Агра-Кобрынскае» лепшае ў раёне па ўраджайнасці збожжа.

**Казакова, А.** Чтобы дети не остались без отдыха / Анна Казакова // Кобрин-информ. - 2015. — 10 сентября. — С. 5.

Оздоровление детей с ограниченными возможностями в Кобринском районе.

**Шпендик, А.** Связистом быть не просто / Андрей Шпендик // Кобрынскі веснік. - 2015. — 21 лістапада. — С. 4.

Об И. Кравчуке - начальнике радиостанции командного пункта 115-го зенитного ракетного полка, уроженце д. Именины.

**Каменкова, М.** Вклад в социальную жизнь общества: праведные места и праведные люди / Марина Каменкова // Брестский курьер. - 2013.— 22 августа. — С. 12,13.

О детском оздоровительном центре «Жемчужинка» возле д. Именины.

**Козлович, В.** Надо успеть / Валентина Козлович // Кобрынскі веснік. - 2013.— 21 жніўня. — С. 1,2.

О детском оздоровительном центре «Жемчужинка» возле д. Именины.

**Пянко, А.** Религиозные конфессии и социальное служение / Алексей Пянко ; фото автора // Кобрынскі веснік. - 2013.— 21 жніўня. — С. 1,2.

Участники журналистского пресс-тура познакомились с жизнью детского оздоровительного центра «Жемчужинка» у д. Именины.

**Пьедестал** почёта // Сельская газета. - 2014. — 16 августа. — С. 6.

В числе лучших сельхозпредприятий с найвысшей урожайностью - ОАО «Агро-Кобринское».

Кобрынскі раён
Імянін
Вёскі